# Сёння ў нумары:

ШЛЯХАМІ ДРУЖБЫ І СУПРАЦОЎНІЦТВА ● СТАРОНКА ПЯЦІКУРСНІКА ● ВЫХАВАННЕ БУДУЧАГА СПЕЦЫЯЛІСТА ● ЮБІЛЕЙ М. ШОЛАХАВА ● СПАРТЫЎНЫЯ НАВІНЫ ● ЛІСТОК ДАІ

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 20 (1094) ● Чацвер, 29 мая 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## У РЭКТАРАЦЕ

**У павестку дня пасяджэння рэктарата, якое адбылося 19 мая, было ўключана адно пытанне: «Аб правядзенні летняй экзаменацыйнай сесіі па ўсіх формах навучання».**

**Дакладчык, прарэктар па вучэбнай рабоце А. Я. Малышаў, падкрэсліў, што летняя экзаменацыйная сесія з'яўляецца апошняй, выніковай у дзевятай пяцігодцы, і таму выкладчыкі і студэнты ўніверсітэта павінны прыкласці ўсе намаганні для таго, каб яна прайшла паспяхова.**

**Неабходна ўжо зараз на ўсіх кафедрах выпрацаваць і абмеркаваць крытэрыі ацэнак адказаў студэнтаў на экзаменах і заліках. Пры гэтым трэба ўлічваць ступень цяжкасці прадмета, наяўнасць падручнікаў і іншай літаратуры па курсу. Сур'ёзнай увагі заслугоўвае наладжванне кантролю за ходам экзаменацыйнай сесіі. Дэканам і загадчыкам кафедр неабходна спланаваць наведванне экзаменаў і залікаў для таго, каб выявіць характар патрабаванняў, прад'яўляемых да студэнтаў.**

**Неабходна падумаць і аб кансультацыях перад экзаменам: праводзіць кансультацыі па выкліку, асабліва для студэнтаў першых курсаў, а таксама індывідуальныя кансультацыі з асобнымі студэнтамі.**

**На ўсіх факультэтах неабходна весці ўлік бягучай паспяховасці студэнтаў.**

**Затым на пасяджэнні рэктарата выступілі: дэкан філфака А. А. Волк, дэкан журфака Р. В. Булацкі, прарэктар па завочнаму і вячэрняму навучанню У. С. Багданаў, прарэктар па вучэбнай рабоце У. Р. Івашын, начальнік вучэбнага аддзела В. С. Далгарукаў.**

## У ПАРТКОМЕ

На чарговым пасяджэнні парткома былі разгледжаны наступныя пытанні: «Аб рабоце партыйнай арганізацыі факультэта журналістыкі па выкананню пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў», «Аб падрыхтоўцы да работы спартыўна-аздараўленчага лагера «Нарач» і іншыя.

З дакладам аб рабоце партыйнай арганізацыі факультэта журналістыкі выступіў прафесар факультэта Б. В. Стральцоў. Ён у прыватнасці падкрэсліў, што пастанова ЦК КПСС з'яўляецца надзвычай сучаснай і важнай. Яна ахоплівае шырокае кола праблем і дае адказы на многія пытанні. Яе выкананне павінна забяспечыць падрыхтоўку журналістаў, здольных выконваць складаныя задачы сённяшняга дня і быць на ўзроўні патрабаванняў будучага.

Пастанова ЦК КПСС абмяркоўвалася на партсходзе, савеце факультэта, на камсамольскім сходзе і кафедрах факультэта. Адбылося сумеснае пасяджэнне кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў, кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі і кафедры гісторыі журналістыкі. На гэтым пасяджэнні намечаны мерапрыемствы па паляпшэнню эканамічнай адукацыі студэнтаў факультэта, як патрабуецца ў пастанове ЦК КПСС. Прынята таксама рашэнне аб выданні падручніка па эканоміцы галін народнай гаспадаркі, разлічанага на студэнтаў факультэта журналістыкі. Работа над падручнікам ужо пачалася.

Разам з тым у рабоце па выкананню пастановы ЦК КПСС ёсць і недахопы. Яшчэ не ўсе камуністы факультэта глыбока пранікліся пачуццём адказнасці за выкананне задач, пастаўленых Цэнтральным Камітэтам партыі перад факультэтамі журналістыкі ВНУ.

Па разгледжанаму пытанню партком універсітэта прыняў пастанову.

## ПАРТЫЙНЫЯ СХОДЫ

У партыйных арганізацыях факультэтаў універсітэта пачалі праходзіць справаздачна - выбарныя сходы. Яны адбыліся ўжо на факультэце журналістыкі, біяфаку, на факультэце прыкладной матэматыкі і ў партарганізацыі факультэта па навучанню замежных студэнтаў, на філфаку, юрфаку, ваеннай кафедры, кафедры грамадзянскай абароны, хімфаку, у выдавецтве БДУ.

Хутка справаздачна-выбарныя сходы пройдуць на астатніх факультэтах.

## ІНТЭРСУВЯЗІ ВДУ

На днях рэктар універсітэта прафесар У. М. Сікорскі вярнуўся з паездкі ў Польскую Народную Рэспубліку. У час візіту ў Кракаў была абмеркавана і падпісана праграма супрацоўніцтва паміж Ягелонскім і Беларускім універсітэтамі на 1976—1977 гады.

Такая ж праграма была абмеркавана і падпісана ў НРБ прарэктарам па навуковай рабоце БДУ Л. В. Валадзько і рэктарам Сафіскага ўніверсітэта.

* * *

Прарэктар БДУ па рабоце з замежнымі студэнтамі І. П. Чэпа пабываў у Іенскім універсітэце (ГДР) для папярэдняга абмеркавання і ўзгаднення рабочай праграмы супрацоўніцтва паміж Іенскім і Беларускім універсітэтамі на 1976—1977 гады.

У час знаходжання ў ГДР І. П. Чэпа меў гутарку ў міністэрстве вышэйшай адукацыі брацкай рэспублікі па пытаннях навучання і выхавання студэнтаў СССР і ГДР. Другой мэтай паездкі быў абмен вопытам работы з замежнымі студэнтамі.

* * *

На Тыдзень інтэрнацыянальнай дружбы ў Самарканд была запрошана дэлегацыя нашага ўніверсітэта. Яе ўзначальваў прэзідэнт інтэрклуба БДУ студэнт В. Стральцоў. Праграма Тыдня ўключала канферэнцыю па пытаннях інтэрвыхавання, знаёмства з горадам і універсітэтам.

Другая дэлегацыя нашай установы пабывала ў Кішынёўскім універсітэце на свяце інтэрнацыянальнай дружбы.

* * *

Віцэ-прэзідэнт інтэрклуба БДУ студэнт ФПМ афганец Іса Даворы і ўдзельніца X сусветнага фестывалю моладзі ў Берліне студэнтка філфака Таццяна Міш (ГДР) прадстаўлялі універсітэцкі КІД на гарадскім вечары інтэрнацыянальнай дружбы.







*На кафедры агульнага праграміравання студэнты 8-й групы III курса факультэта прыкладной матэматыкі абараняюць курсавыя работы.*

*Людміла Фёдарава расказвае аб сваей тэме «Метады упарадкавання ўводу і пошуку інфармацыі ў памяці».*

*Уважліва і зацікаўлена слухаюць студэнтку члены камісіі і аднакурснікі.*

*Фота Т. САХАШЧЫК.*

## ВУЗЫ БРАЦТВА МАЦНЕЮЦЬ

Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна і Сафійскі універсітэт імя К. Ахрыдскага, кіруючыся рашэннямі XXIV з'езда КПСС і X з'езда БКП, а таксама прынятай на XXV сесіі СЭУ комплекснай праграмай далейшага паглыблення і ўдасканалення супрацоўніцтва і развіцця сацыялістычнай эканамічнай інтэграцыі краін — членаў СЭУ, улічваючы рэкамендацыі нарады рэктараў супрацоўнічаючых ВНУ, якая адбылася ў г. Кіеве ў кастрычніку 1974 года, узаемны вопыт сумесных навуковых даследаванняў, амбену вучонымі, аспірантамі, студэнтамі з мэтай рэалізацыі пагаднення аб навуковым і культурным супрацоўніцтве паміж двума універсітэтамі ад снежня 1968 года, дамовіліся аб плане супрацоўніцтва на 1976—1977 гады.

У план уваходзіць абмен вучонымі. Так, у 1976—1977 гадах у Сафіскім універсітэце пабываюць дэкан біялагічнага факультэта прафесар А. Ц. Пікулеў, дэкан факультэта прыкладной матэматыкі прафесар Я. А. Іваноў, дэкан гістфака дацэнт І. О. Царук, дацэнт кафедры рускай савецкай літаратуры В. А. Захарава, загадчык кафедры фізікі паўправаднікоў фізфака прафесар В. Д. Ткачоў, дацэнт В. М. Ламака, прафесар Н. А. Лукашэвіч, дацэнты В. П. Красней, В. В. Казлова і іншыя.

У сваю чаргу Сафіскі універсітэт накіруе для чытання лекцый для студэнтаў БДУ прафесара В. Цонева, дацэнта Я. Вякілава, прафесара, доктара А. Шалудзько, навуковага супрацоўніка А. Папова, дацэнтаў Е. Мецяву, І. Вялінава, М. Хаімаву і іншых.

Вучоныя БДУ і Сафійскага універсітэта будуць працягваць сумесныя даследаванні, абмен навуковай інфармацыяй і літаратурай. Будуць працягвацца сумесныя навуковыя даследаванні па фізіцы і тэхналогіі паўправадніковых матэрыялаў, сумесная работа дацэнта БДУ Д. Б. Мельцара і дацэнта Сафійскага універсітэта Іардана Тончава «Дружба, змацаваная крывёй». Пачнуцца сумесныя навуковыя даследаванні лінейных электронных сістэм для вымярэння і даследавання фізічных працэсаў, праграмнага забеспячэння сучасных вылічальных сістэм АСК і па іншых тэмах.

Упершыню ў дагаворы прадугледжаны абмен студэнтамі і аспірантамі на ўвесь тэрмін навучання.

Адбудзецца абмен студэнтамі для распрацоўкі і падрыхтоўкі дыпломных работ.

Універсітэты дамовіліся, што будуць спрыяць арганізацыі і правядзенню навуковых канферэнцый і сімпозіумаў. Яны абмяняюцца удзельнікамі навуковых канферэнцый па праблемах беларуска-балгарскіх моўных паралеляў.

У 1976—1977 гадах Сафіскі універсітэт арганізуе семінар па тэме «Еўропа пасля другой сусветнай вайны», калёквіум па алгебры, сімпозіум па тэме «Методыка выкладання ў журналістыцы».

Адбудзецца абмен дэлегацыямі, у якія ўвойдуць прадстаўнікі партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый для узаемнага вывучэння вопыту работы.

План супрацоўніцтва складзены ў Сафіі. Яго падпісалі прарэктар БДУ па навуковай рабоце Л. В. Валадзько і рэктар Сафіскага універсітэта Бл. Сендаў.

# ЗА ПЛЯЧЫМА — ДЗЕВЯЦЬ СЕСІЙ

## СТАРОНКА ВЫПУСКНІКА

ВОСЬ, здаецца, і усё. Здадзены сесіі, запоунены залікоукі да апошняга лістка, куплены білеты да месца працы, і хутка вагонныя колы будуць рытмічна выстукваць: «Бывай, універсітэт»...

Усе студэнты крышачку зайздросцяць пяцікурснікам. Іх жа чакае не практыка, як у мінулыя гады, а сапраудная работа, адзнаку за якую будзе ставіць само жыццё. О, як вабіць малодшакурсніка поуная самастойнасць, незалежнасць — а іменна з такім выглядам ходзяць сёння выпускнікі. І толькі часам у вачах іх прамільгне ціхі сум.

Кажуць, студэнцкія гады — самыя непауторныя. Калі вучышся — не адчуваеш ніякай непауторнасці, асаблівасці. Але праходзіць час, і ты, «абцяжараны» работай, дзецьмі і бясконцымі клопатамі, раптам прыпамінаеш першую студэнцкую вясну, свой інтэрнат і уважлівы позірк любімага выкладчыка.

Таму і сумуюць сённяшнія выпускнікі, хоць у думках яны ужо на сваім працоуным месцы.

— Што вы возьмеце з сабой у дарогу?

— Назапашаныя веды!

— Студэнцкую прывычку позна класціся, рана уставаць.

— Незаспакоенасць усюды і ва усім.

Што ж, застаецца пажадаць табе, выпускнік, як на самым складаным экзамене, ні пуху, ні пер'я! Будуць цяжкасці, будуць радасці, але калі гады вучобы для цябе не прайшлі дарэмна, калі ты загартаваўся, адчуў сябе па-сапрауднаму самастойным, гатовым да поунай адказнасці за свае справы, поспех не прымусіць доуга чакаць.

Шчаслівага табе шляху!

## ЖЫВЕ ТАКАЯ ДЗЯЎЧЫНА



Людміла Мароз — выпускніца факультэта журналістыкі. Здаецца, усе пяць гадоу была ціхай, часам непрыкметнай на курсе.

Але...

— Калі цяжка, заусёды да яе звернешся. Падкажа практычнае, разумнае выйсце...

— Люда адчувае чалавека, вы разумееце? А між тым сама аб сабе ніколі не клапоціцца. Пра сваю бяду ніколі не раскажа. Тут яна нават замкнёная...

— Жыццё яе часта стукала аб вострыя вуглы, вось таму і чулая да чужых няшчасцяу. А яшчэ яна вельмі упартая. Дыпломная работа у Мароз была не з лёгкіх — «Бялінскі ва успамінах сучаснікау». Напісала амаль палову, і тут выявілася, што не у тым кірунку. Іншая б рукі апусціла. А Люда усё па-новаму перарабіла. Яшчэ не ведаю, як яна абароніцца, але думаю — будзе «выдатна»!

— А я памятаю яе абітурыенткай. Пытаюся: «Ну, што табе сказалі на субяседаванні?» — «Забылася ад хвалявання, здаецца, «на бульбу» пашлюць». Потым на сельгасработах два гады была нязменнай паварыхай. Раней усіх уставала, пазней клалася спаць. На снеданне і вячэру паспявала прыгатаваць па тры стравы. А ведаеце, як «на бульбе» есці хочацца!

— Памятаю, па тэхніцы афармлення газеты наша «ціхоня» лепш за усіх падлічвала пункты...

— Мне падабаецца яе акуратнасць. Добрая будзе некаму жонка...

— У чытальні можа цэлы дзень прасядзець. Не, яна не «зубрылка», проста хоча усё ведаць. Прауда, часам працуе да знямогі. Ці ж трэба гэтак?!

— Чула аднойчы, як яна сказала: «Факультэт мне многа дау. Я стала разумнейшай, смялейшай».

— Дзяцей любіць...

Яшчэ шмат маглі сябры расказаць пра Люду Мароз. І усе іх словы былі самыя удзячныя.

Выказванні пяцікурснікаў запісала **С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**

## АПОШНІ КРОК ДА ДЫПАОМА









**Было у гэты дзень надзвычай цесна у невялікім пакоі кафедры гісторыі КПСС. І не дзіуна — пачыналася абарона дыпломных работ выпускнікамі кафедры.**

**Па-рознаму: то ўсхвалявана, то ўпэўнена раскрываюць сутнасць сваіх даследаванняу выпускнікі. Грунтоуна і добразычліва аналізуюць іх работы рэцэнзенты. Тэмы дыпломных самыя розныя. У Валянціны Скрыпскай, напрыклад, — «Петрыкау. Гістарычны нарыс».**

**«Хварэюць» за сяброу аднакурснікі — тыя, каму абараняцца сёння або праз дзень—другі.**

## СЛОВА АБ ВЫХАВАНЦАХ



ЗА ДЗЕВЯЦЬ год свайго існавання кафедра метадау аптымальнага кіравання ФПМ падрыхтавала больш за 150 спецыялістау.

Расказвае выкладчык кафедры, кандыдат матэматычных навук В. Крахотка:

— Асноуная маса нашых выпускнікоў займаецца навукова-даследчай работай у інстытуце матэматыкі АН БССР, а таксама ва універсітэце.

Як і я, скончылі аспірантуру цяперашнія кандыдаты навук С. Мінюк, Б. Каліцін, В. Кірліца, М. Карпіевіч, А. Калінін і іншыя. Сёння яны супрацоунікі нашай кафедры і кафедры тэорыі верагоднасцей і матэматычнай статыстыкі. Старшымі навуковымі супрацоунікамі І. Гайшуном, Т. Капейкінай, В. Гарахавіком і многімі іншымі былымі «аптымістамі» вельмі задаволены ў інстытуце матэматыкі.

— Ну, а хто прыйшоу ім на змену? Што характарызуе пяцікурсніка-75?

На гэтыя пытанні адказвае загадчык кафедры Р. Ф. Габасаў:

— Можна смела сказаць: да нас ідуць самыя падрыхтаваныя, моцныя студэнты. Гэта людзі, якія добра вывучылі свае рэальныя магчымасці і цвёрда вырашылі, дзе спецыялізавацца.

Вылучыць самых лепшых сярод нашых 25 пяцікурснікаў—справа не з лёгкіх. Але паспрабую.

Л. Гарадзецкі — здольны, прынцыповы студэнт, доугі час быу у складзе камітэта камсамола ФПМ. Выканау некалькі сур'ёзных навуковых работ на высокім узроуні. Адна з іх здадзена у «Веснік БДУ», іншыя—ва усесаюзны часопіс «Дыферэнцыяльныя урауненні».

А. Астроускі добра паставіу на факультэце работу СНТ. Па размеркаванню ён будзе працаваць у інстытуце матэматыкі.

Т. Калеснік — таксама былы член камітэта камсамола ФПМ. Нядаўна у друку паявіуся яе артыкул аб прымяненні матэматычных метадау у медыцынскай дыягностыцы.

З трэцяга курса друкуецца і А. Кругер. Як здольнага студэнта мы ведаем і В. Карпука.

Сёлета кафедра выпускае чатырох прадстаунікоу замежных краін. Гэта — афганец Іса Даворы і тры балгарскія дзяучыны Б. Маскоуска, Ю. Сімеонава, М. Васілева. Першыя дзве студэнткі — актыуныя удзельніцы мастацкай самадзейнасці балгарскага зямляцтва, добра вучацца. М. Васілева будзе рэкамендавана для паступлення у аспірантуру.

Аб усіх нашых студэнтах расказаць, канешне, немагчыма. Магу толькі пажадаць ім добрай працы.

**С. УСЦІНОВІЧ.**

ЮРЫДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ

## ЦЯБЕ НАКІРАВАЛІ Ў ВЁСКУ

Дзеючае заканадауства і спецыяльная пастанова ЦК КПСС і Савета Міністрау СССР аб сельскай школе прадугледжвае для настаунікау і іншых педагагічных работнікау, пражываючых у сельскай мясцовасці, шэраг ільгот і перавагаў.

Перш за усё ім прадастаулена права на бясплатнае карыстанне жылой плошчай з ацяпленнем і асвятленнем па установленых у данай мясцовасці нормах. У асобных выпадках права на льготы па камунальных паслугах застаецца за педагагічнымі работнікамі і пры пакіданні работы. У прыватнасці за жанчынамі на перыяд догляду дзіцяці ва узросце да году; за настаунікамі, якія пайшлі на пенсію, і за пражываючымі з імі членамі сем'яу, калі агульны стаж работы педагога у школах сельскай мясцовасці складае не менш 10 гадоу.

Жылплошча настаунікам выдзяляецца выканкомамі мясцовых Саветау дэпутатау працоуных. Пры адсутнасці свабодных кватэр яна павінна быць прадастаулена у наёмных памяшканнях за лік адпаведных выканкомау, установ і арганізацый па сапраўднай іх вартасці. Прычым закон прадугледжвае, што настаунікам і іншым работнікам асветы паліва павінна быць прывезена да месца пражывання у памеры гадавой патрэбы не пазней 1 верасня бягучага каляндарнага года.

Маладым спецыялістам, якія закончылі вышэйшыя і сярэднія назучальныя установы і накіраваны на работу у сельскія агульнаадукацыйныя школы, прадастауляецца пазыка на гаспадарчае упарадкаванне у памеры да 1000 рублёу на тэрмін да 5 гадоу з пагашэннем пачынаючы з трэцяга года пасля атрымання. Яны маюць права узяць пазыку на будаунцтва жылога дома у памеры да 2.000 рублёу на 10 гадоу з пагашэннем пачынаючы з пятага года пасля яе атрымання.

Устаноўлена таксама адтэрміноука ад прызыву на абавязковую ваенную службу настаунікам - мужчынам з вышэйшай педагагічнай адукацыяй пасля заканчэння ВНУ на увесь перыяд іх працы у сельскай школе.

